Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 27 (640) Пятніца, 23 верасня 1966 года. Год выдання XIX. Цана 2 кап.

Ленінская эстафета

Першы семінар. І. Шынгель і В. Аржанкоў дзеляцца вопытам камсамольскай работы

На ФІЗФАКУ і хімфаку адбылася сустрэча новавыбранага камсамольскага актыву І курсаў з камсамольскімі важакамі факультэтаў. Сакратары камітэтаў камсамола хімфака В. Аржанкоў і фізфака І. Шынгель расказалі прысутным аб рабоце камсамольскай арганізацыі ВНУ, аб частковых зменах у Статуце ВЛКСМ. Падзяліліся вопытам работы загадчыкі сектараў. Яны пазнаёмілі маладых актывістаў з задачамі камсамольскай работы курсаў, факультэтаў на І семестр 1966-67 навучальнага года.

«ЗАДАЧА ДАЛЕЙШАГА ЎМАЦАВАННЯ ПАРТЫІ НАСТОЙЛІВА ПАТРАБУЕ ПАВЫШЭННЯ БАЯЗДОЛЬНАСЦІ ПЯРВІЧНЫХ ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ, ЯКІЯ СКЛАДАЮЦЬ ЯЕ АСНОВУ. ПЯРВІЧНЫЯ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ СА СВАЁЙ ШЫРОКАЙ СЕТКАЙ ЦЭХАВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ І ПАРТЫЙНЫХ ГРУП АДЫГРЫВАЮЦЬ РАШАЮЧУЮ РОЛЮ Ў АЖЫЦЦЯЎЛЕННІ ПАЛІТЫКІ ПАРТЫ, У ВЫХАВАННІ КАМУНІСТАЎ, ЗВЯЗВАЮЦЬ ПАРТЫЮ З МАСАМІ, ДЗЕЙНІЧАЮЦЬ ТАМ, ДЗЕ ІДЗЕ НЕПАСРЭДНЫ ПРАЦЭС БУДАЎНІЦТВА І СТВАРАЛЬНАЙ ПРАЦЫ».

(З даклада таварыша Л. І. Брэжнева на XXIII з'ездзе Камуністычнай партыі Савецкага Саюза).

У АСПІРАНЦКАЙ ПАРТГРУПЕ

КАЛЯ ГОДА ПРАЙШЛО з той пары, як была створана аспіранцкая партыйная група грамадскіх факультэтаў. За гэты час яна прарабіла некаторую работу па прапагандзе вучэння Маркса, Энгельса, Леніна, гісторыі і слаўных старонак з жыцця Камуністычнай партыі, рашэнняў XXIII з'езда КПСС. Так, камуністы партгрупы прынялі актыўны ўдзел у прапагандысцкай рабоце сярод насельніцтва гарадоў і вёсак рэспублікі і агітацыйнай—у час выбарчай кампаніі ў горадзе Мінску.

Аспірантамі быў выпушчан зборнік тэзісаў дакладаў, прысвечаных ленінскім дням. Трое аспірантаў абаранілі кандыдацкія дысертацыі. Гэта таварышы Іоська, Баркан, Міхайлаў.

Пасля справаздачнага даклада сакратара партгрупы Я. Асіпкова разгарнуліся спрэчкі. Камуністы тт. Сергіеўская, Беркаў і іншыя закранулі надзённыя пытанні аспіранцкага жыцця. Указвалася, напрыклад: аспіранты маюць некаторыя цяжкасці ў друкаванні навуковых артыкулаў, што стрымлівае абарону дысертацый. Выказвалася таксама думка аб неабходнасці стварэння пры нашым універсітэце сваёй друкаванай базы.

Асаблівыя прэтэнзіі ў аспірантаў-камуністаў былі ў адрас гаспадарчай часткі універсітэта, якая мала клапоціцца аб стварэнні нармальных жыццёвых умоў у інтэрнатах. У пакоях жыве па чатыры аспіранты, што не дае магчымасці для нармальнай навуковай працы. Прапанавалася пасяляць аспірантаў не больш, як па два ў пакоі.

Выступаючыя таксама гаварылі аб неабходнасці стварэння спрыяльных умоў для культурнага адпачынку аспірантаў.

Было вырашана сіламі аспірантаў падрыхтаваць навуковы зборнікаў да вялікай падзеі ў жыцці савецкага народа—50-годдзя Савецкай улады.

На сходзе камуністы абралі новага сакратара партыйнай групы Анатоля Ягорава—аспіранта кафедры ўсеагульнай гісторыі.

І. ШПАДАРУК.



Калі ў чалавека здзяйсняецца мара—можна сказаць: ён шчаслівы. Але колькі для гэтага трэба напорыстасці, працалюбства... Аляксандр Малышаў. Ён—студэнт І курса фізфака, член зборнай каманды універсітэта па баскетболу, кандыдат у юнацкую зборную рэспублікі.

Падрыхтоўчы факультэт за тыдзень

ДНЯМІ в'етнамскія і афрыканскія студэнты падрыхтоўчага факультэта — усяго 150 чалавек былі гасцямі Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі. Перад замежнымі сябрамі выступіў Старшыня таварыства, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР Віталій Сцяпанавіч Смірноў, які расказаў аб мінулым і сучасным Беларусі, аб культурных сувязях рэспублікі з іншымі краінамі. Затым гасцям былі паказаны хранікальна - дакументальныя фільмы аб вызваленні рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, а таксама аб сённяшнім Мінску.

□ □

ЦЁПЛА сустрэлі юныя чыгуначнікі — піянеры Мінска студэнтаў В'етнама, Камеруна, ПАР, Нігерыі, Цэнтральна-Афрыканскай рэспублікі Конга (Браззавіль), што займаюцца на падрыхтоўчым факультэце. Яны расказалі гасцям аб сваёй Малой чыгунцы. Затым замежныя студэнты зрабілі падарожжа на карлікавым цеплавозе.

□ □

НА ГЭТЫМ тыдні студэнты падрыхтоўчага факультэта для замежных грамадзян пабывалі на экскурсіі па месцах Мінскага партыйнага і камсамольскага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

□ □

АДБЫЛАСЯ навукова-метадычная канферэнцыя супрацоўнікаў падрыхтоўчага факультэта для замежных грамадзян. Канферэнцыю адкрыў дэкан факультэта М. К. Гарбачоў. Па розных пытаннях паляпшэння вучэбна-выхаваўчага працэсу на факультэце, дзе займаюцца студэнты з розных краін свету, выступілі з дакладамі выкладчыкі кафедры рускай мовы М. С. Мяцельскі, А. В. Самаль, А. Ул. Саннікава і іншыя.

ГОСЦІ ЗАХАПЛЯЮЦЦА

Дэлегацыі студэнцкіх маладзёжных арганізацый Чэхаславакіі, Польшчы, Францыі, Англіі, ФРГ, Гватэмалы, Коста-Рыкі, Афганістана і іншых пабывалі ў гасцях у нашым універсітэце. Усхвалявання сустрэчы. Госці захапляюцца побытам і вучобай савецкіх студэнтаў.

За апошні час усё больш і больш прадстаўнікоў студэнцкіх маладзёжных арганізацый розных краін свету прыязджае ў наш універсітэт. Толькі за леташні год нас наведалі дэлегацыі студэнтаў Польшчы, Чэхаславакіі, МНР, Афганістана, Англіі, Францыі, ФРГ, Гватэмалы, Коста-Рыкі і імногіх іншых. Адбыліся цікавыя, незабыўныя сустрэчы студэнтаў розных народаў. І кожны раз госці ад'язджаюць ад нас з мноствам самых розных прыемных уражанняў, з удзячнасцю за гасціннасць і дабразычлівасць, якую яны адчулі ў спатканнях з савецкай моладдзю.

Прадстаўнікі капіталістычных краін цікавяцца пытаннямі побыту і сацыяльным паходжаннем студэнтаў нашага ВНУ.

— Чые дзеці навучаюцца ў нашым універсітэце?—як правіла, пыталі студэнты капіталістычных краін.

Для нас такое слуханне было дзіўна. Пасля станавіцца зразумелым, чаму іменна пра гэта яны цікавіліся. З недавер'ем адносяцца яны, напрыклад, да таго, што ў нас маюць аднолькавыя правы на вучобу, усе што усе ў нас роўныя сярод роўных, што стыпендыю атрымліваюць 70 працэнтаў студэнтаў. Ім не верыцца, што вучыцца дапамагае дзяржава...

Усе госці з капіталістычных краін у адзін голас захапляюцца карпусамі нашага універсітэта, актавай залай, аўдыторыямі, лабараторыямі і іх цудоўным абсталяваннем, выдатным прафесарска-выкладчыцкім калектывам, побытам савецкіх студэнтаў.

19 верасня прадстаўнікі маладзёжных студэнцкіх арганізацый Гватэмалы і Коста-Рыкі з хваляваннем азнаёміліся з нашым універсітэтам, сустрэліся і пагутарылі з камсамольскімі актывістамі. Яны адкрыта расказалі пра жыццё і побыт студэнтаў сваіх краін.

— Сіла дзяржавы, — сказаў прадстаўнік Гватэмалы,—заключаецца ў тым, як вучыцца моладзь, як шануе яна сваю дзяржаву...

Іх здзівіў той факт, што ў Беларусі ў два разы больш насельніцтва, чым у Гватэмале, але тут каля сто тысяч студэнтаў, у той час, калі ў Гватэмале іх каля дзесяці тысяч.

У Гватэмале толькі тры універсітэты (больш ніякіх вну няма): дзяржаўны універсітэт у Сан-Карласе і два прыватныя—каталіцкі і евангелісцкі. У дзяржаўным універсітэце ў Сан-Карласе—шэсць тысяч студэнтаў. Вячэрняга і завочнага навучання там наогул не існуе. Кожны студэнт павінен плаціць у год 60 долараў толькі за тое, што ён слухае лекцыі. Атрымлівае стыпендыю толькі адзін працэнт студэнтаў. За кватэру, карыстанне падручнікамі і іншымі неабходнымі дапаможнікамі трэба плаціць вялікія грошы. Таму студэнты вымушаны наймацца на любую работу, зарабляць грошы на вучобу і жыццё. Часам тэрмін навучання працягваецца ў іх дзесяць год.

Пасля такіх сустрэч заўсёды думаеш: ты — савецкі студэнт, лёс твой—шчаслівы, ты—акружаны паўсядзённымі клопатамі Камуністычнай партыі і Савецкага Урада.

Г. РЫЛЮК,
сакратар камітэта камсамола.

ЗАПРАШАЕМ НА ХІМФАК

НЯДАЎНА ў наш універсітэт на вучобу прыехала вялікая група в'етнамскіх юнакоў і дзяўчат. Пяцёра з іх вывучылі рускую мову на радзіме. Іх адразу прынялі на вучобу на абраны імі факультэт—хімфак.

На здымку вы бачыце намесніка дэкана хімфака (у цэнтры) В. Ф. Цікавага, які расказвае в'етнамскім студэнтам пра спецыфіку, умовы жыцця, вучобы і працы студэнтаў-хімікаў.

ПРАЦАВАЛІ ЗДОРАВА— У ЗГОДЗЕ, З

Сустрэча цаліннікаў на вакзале г. Мінска.

РЭХА ЦАЛІНЫ

Каторы ўжо раз я перагортваю старонкі цаліннага дзённіка. Кароткія запісы, першы з якіх зроблен яшчэ ў вагоне поезда, калі ехалы сюды.

«27 чэрвеня. Другі дзень у дарозе. Ад хвалявання і стомленасці баліць галава. У штабным купэ камандзір і начальнік эшалона Міша Трацяк, Тамара Скудная і я. Тамара—наш дыктар, канферансье і адказная за канцэрт. Яна пачынае канцэрт, сам іду правяраць насценгазеты. Добрыя газеты ў атрадах БДУ «Зубронак», «Аэліта», «Буравеснік», «Грэнада», «Вікторыя», «Вясёлка» і «Электрон-66»—Мінскага радыётэхнічнага інстытута, а таксама ў магілёўскіх і брэсцкіх студэнтаў».

Тут жа наступны запіс: «У радыёбудцы эшалона цесна. Якасць дынамікаў не вельмі добрая, затое запалу і ўзнёсласці ў артыстаў—пазайздросціць. Пачынаюць канцэрт «зубронкаўцы»-філолагі БДУ Валя Тхарова і Люда Карасёва і «аэлітаўцы», нашы фізікі. Студэнты універсітэта перадаюць сваё прывітанне студэнтам радыётэхнічнага інстытута, запрашаюць іх да мікрафона. Апошнія не застаюцца ў даўгу. Пасля іх—слова самадзейным артыстам з атрада «Брыганціна».

Да пабачэння, Еўропа! Прывітанне, Азія!

Вось ён, апеты ў песнях, авеяны легендамі імклівы бацька Ўрал. Яшчэ ў школе мне не раз даводзілася чуць, як настаўнік геаграфіі, расказваючы пра граніцу паміж Еўропай і Азіяй, зазначаў: «Многім з вас, магчыма, самім давядзецца пабываць у тых мясцінах і асабіста ўбачыць гэту граніцу!»

Нават не верыцца, што яшчэ крок, два і — Азія.

Да пабачэння, Еўропа! Прывітанне, Азія!

Наш шлях—у атрад «Брыганціна». Яшчэ ў штабе я даведаўся, што ён размясціўся ў саўгасе «Чапаеўскі» і што ад райцэнтра, гарадскога пасёлка Чапаеў, да цэнтральнай сядзібы саўгаса больш чым трыццаць кіламетраў.

Сустрэў нас сам брыгадзір Вася Цар. Яго брыгада, акрамя двухпавярховага саманнага пабудуе яшчэ і аднакватэрны жылы дом з чароту. Работу пачалі нядаўна, але тэмпы настолькі імклівыя, што за тры дні былі заліты фундаменты і ўзведзены сцены абодвух аб'ектаў. Тут жа мы пазнаёміліся з будаўнікамі брыгады Мікалаем Сушам, Валерыем Дземянцовым, Уладзімірам Войцікам, Сашам Лапаткам, братамі Юрыем і Валерыем Шутавымі, Сашам Лемешавым і Алай Курылёнак.

Камандзір атрада Мікола Кучынскі гаворыць з вялікім хваляваннем, адчуваецца, што справы атрада непакояць яго заўсёды.

— Усё, што мы робім зараз—гэта толькі «прадмова». Галоўнае—наперадзе. Праз дзень-два пачнем будаўніцтва шматпавярховай школы.

У напружанай працы незаўважна падыходзіць вечар. Стомленыя за дзень маладыя будаўнікі вяртаюцца ў лагер. У сталовай іх чакае смачная вячэра. Нездарма ж Яўгень Быцко, намеснік камандзіра па гаспадарчай частцы, увесь дзень быў на складах, кухні і ў магазінах. А пакуль што ў штабе атрада кароткая нарада. За сталом—камандзір, камісар, брыгадзір, рэдактар насценгазеты, адказны за палітмасавую і агітацыйную работу. З гасцей—сакратар камсамольскай арганізацыі мясцовага калгаса Таня Іванова і загадчык клуба цэнтральнай сядзібы Гайса Куснегінаў. Заўтра у саўгасе вялікае свята—Дзень жывёлавода. З самых далёкіх ферм прыедуць сюды заслужаныя і паважаныя людзі паслухаць адзін аднаго, абмяняцца вопытам, выказаць свае заўвагі і прапановы.

Запісы, запісы, запісы. Кароткія, не вельмі красамоўныя вытрымкі з дарожнага дзённіка. Але за кожным з гэтых радкоў—сябры-студэнты, іх штодзённыя справы, гераіка цалінных будняў.

А. Ярохін.

Чапаеўскі раён,
Уральская вобласць.

Спіць цалінны стэп. Толькі не спіцца рамантыкам...

Пройдуць гады. Хто-небудзь з равеснікаў гэтых хлопцаў скажа дапытлівым юнакам XXI стагоддзя: «Гэты дом будавалі студэнты БДУ».



СПРАВАЗДАЧУ ДАЕ КАМАНДЗІР

Мы працавалі ў тых месцах, дзе ў грамадзянскую вайну змагаўся легендарны герой Васіль Іванавіч Чапаеў.

Галоўнае было, вядома, праца. І мы штурмавалі яе па-чапаеўскі. Усяго нас было 774 студэнты з васьмі вну. Нам трэба было асвоіць адзін мільён пяцьсот тысяч рублёў. Мы справіліся. Асвоілі іх.

Добра паказалі сябе студэнты Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна: будучыя фізікі з атрада Мікалая Кучынскага, Аркадзя Баброва, філолагі з атрада Алега Слукі, атрад гісторыкаў Міхаіла Юдзінкі.

Хлопцы ў атрадзе ў нас былі ўсе, як дубы, дужыя. Многія — «старыя», ужо не першы раз прыязджалі на цалінныя землі і, вядома, маглі б зрабіць значна болей, чым мы рабілі. Уся бяда ў тым, што з-за няхваткі механізмаў і матэрыялаў мы часам заставаліся без работы. Шмат часу трацілася на забеспячэнне студэнтаў жыллём, харчаваннем. Упушчаны час мы стараліся нагнаць. Хоць гэта было і нялёгка. Мы ведалі, што да канца будаўнічага семестра заставалася ўсё менш і менш часу і стараліся працаваць так, каб не толькі выканаць, але і перавыканаць план. І гэта нам удалося. Вярнуліся мы ў студэнцкія аўдыторыі з поўнай перамогай.

Міша ТРАЦЯК,
камандзір атрада імя Чапаева — Тайпанскага раёна.

З ГІСТОРЫІ ЦАЛІННЫХ БУДОЎЛЯЎ

У 1958 годзе 650 студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна дапамагалі цаліннікам Какчэтаўскай вобласці ўбіраць багаты ўраджай. Сёння мы публікуем некалькі матэрыялаў, знойдзеных у архіве рэдакцыі нашай газеты, якія расказваюць аб буднях цаліннікаў 1958 года. Праўда, тады студэнты БДУ працавалі пераважна на ўборцы ўраджаю, а цяпер едуць на цалінныя новабудоўлі. Але, па сутнасці, і сёлета нашы студэнты дапамогуць убіраць ураджай, бо вызваляць працаўнікоў саўгасаў ад будаўнічых работ.

МЫ ПРАЦУЕМ у зернесаўгасе «Цалінны» Рузаеўскага раёна Какчэтаўскай вобласці ў брыгадзе № 9. Уборка ўраджаю падыходзіць к канцу. Брыгада № 1 поўнасцю ўжо закончыла ўборку. Цяпер у нас даволітакі складаныя кліматычныя ўмовы. Выпаў снег, пачаліся замаразкі. Але камсамольцы БДУ не спалохаліся цяжкасцей. Яны працягваюць паспяхова працаваць на шчасце роднай краіны. Дырэкцыя зернесаўгаса выдала нам усім цёплыя рэчы. Некаторыя з нас заяўляюць, што згодны застацца ў саўгасе да новага года.

Багаты ўраджай у гэтым годзе ў Казахстане. Сваё абяцанне — даць Радзіме мільярд пудоў збожжа — казахстанскія камсамольцы выконаюць з гонарам. У гэтай вялікай, высакароднай справе дапамагаем ім і мы, камсамольцы Беларусі.

У НАС пачалася ўборка ўраджаю. А ён у гэтым годзе вельмі багаты, нават лепшы, чым быў у 1956 годзе. Так што прыдзецца многа папрацаваць. Зернесаўгас «Цалінны», у якім мы працуем, узяў абавязацельства здаць дзяржаве 3 млн. 100 тысяч пудоў пшаніцы. Па раёну мы арганізавалі спаборніцтва паміж латышамі і беларусамі. У «Цалінным» брыгада Сяргеева выступіла са зваротам да ўсіх студэнтаў універсітэта ўключыцца ў спаборніцтва паміж брыгадамі і ўзяла на сябе пэўныя абавязацельствы. Гэты зварот мы абмяркоўваем ва ўсіх брыгадах.

Нашы студэнты ўдзельнічаюць не толькі ва ўборцы, але і ў будаўніцтве. Так, гісторыкі і географы абавязаліся пабудаваць кароўнік, група юрыстаў—майстэрню, хлявы, надбудовы да жылых дамоў.

Ва ўсіх брыгадах выпускаюцца «баявыя» лісткі, у якіх расказваецца аб нашых справах.

НАТХНЕННЕМ

☆ ☆ ☆

А ЯНЫ ВУДАВАЛІ ДОМА

АДНОСІНЫ да студэнцкіх будаўнічых атрадаў, якія заставаліся працаваць у сваёй рэспубліцы, яшчэ не так даўно былі даволі скептычныя. Вось цаліна — гэта справа! І цалінікі звычайна вяртаюцца дамоў гордыя, задаволеныя і вясёлыя. На іх долю прыпадае 90 працэнтаў «лаўраў», пашаны і ўсеагульнай павагі. А юнакі і дзяўчаты з «мясцовых» атрадаў неяк лічаць за лепшае менш гаварыць пра сваю работу летам. На іх долю «лаўраў» застаецца не вельмі многа. Хоць, скажам, адзін толькі універсітэт штогод фарміруе некалькі атрадаў для беларускага «трэцяга семестра».

І вось я ў адным з іх.

МЫ СТАІМ з камандзірам атрада Валерыем Маскалікам на будаўнічай пляцоўцы.

— Валера! Колькі вас тут?

— Дваццаць два. Адзін хімік, астатнія фізікі. У асноўным-першы і другі курс. Толькі забеспячэнец з трэцяга.

— А што будуеце?

— Карпусны. Кошт яго — каля 30 тысяч рублёў па дагавору з «Міжкалгасбудам». Матэрыял — блокі. Загадзя папярэджваю: будматэрыял ёсць, забеспячэнне добрае, так што пра недахопы многа не напішаш.

— Надвор'е не перашкаджае?

— Пакуль што — не.

— А як хлопцы, не сумуюць?

— Ну што вы! Праўда, спачатку цяжка было. Ніхто ж ніякага уяўлення аб будаўніцтве не меў. Але нічога, навучыліся. Мы і сесію ўсе здалі нядрэнна. І наогул жывём тут весела — возера побач, крыніца... Працуем па дзесяць гадзін у суткі, выхадны — раз у два тыдні...

МНЕ пашанцавала — я трапіў у атрад у аўральны дзень. Збіралася на дождж, і трэба было тэрмінова заліць усе траншэі бетонам. Інакш дождж усё размые, і работа некалькіх дзён прападзе.

— Ну што ж, хлопцы, трэба рвануцца, — сказаў камандзір.

І хлопцы «рванулiся». «Марская пяхота» атрада ў саставе Валерыя Раманоўскага і Навума Гарэліка, (на іх — паласатыя нацельнікі) паказала не тое, што вышэйшы, а проста ўнікальны клас падносу каменя. Бетонамяшалка працавала без затрымкі. А на байках, там, дзе бетон замешваюць у ручную, чуецца адчаянны голас Славы Салаўёва:

— Тры, два, адзін, нуль! — і праз пару хвілін бетон аказваецца замешаным усухую. Тады да яго падступае брыгада «мокрамяшальнікаў» і, пільна назіраючы за тым, каб «не прарваліся танкі», ці іншымі словамі, каб вада не збегла, выносячы з сабой каштоўнае цэментнае «малачко», хутка і спрытна даводзіла бетон «да кандыцыі». Тут жа яго падхоплівалі і адносілі.

Пайшоў дождж, але работа не спынялася. І тое, што было намечана на гэты дзень, было зроблена.

САМАЕ прыемнае — гэта «перакур» сярод рабочага дня. У маленькі шчытавы домік каля бетонамяшалкі набіваюцца ўсе... Там стаяць тры лаўкі, як у рускіх казках, высокая, сярэдняя і маленькая. На іх і рассаджваюцца ўсе— ад «малога» Віці Батырава (адзін метр дзевяноста восем сантыметраў) да сапраўдных малых з калгаса, якія прыбягаюць на пляцоўку. Яшчэ стаіць там стол з вядром вады. У доміку цёмна і цесна. Хлопцы і дзяўчаты адпачываюць. Нават бетонамяшалка заціхае і, здаецца, адпачывае таксама.

Але ў самім доміку не ціха. Цяпер можна і пагаварыць. Пачынае Слава:

— Чуеш, камандзір, бетонамяшалка ў нас заўсёды не працуе, калі перакур?

— Вядома.

— Значыцца, калі яна не працуе, тады перакур?..

— Так, —адказвае Валера, яшчэ не падразумяваючы каверзы.

— А калі бензіну не будзе? — працягваюць кпіць з камандзіра.

Акрамя таго, што дзяўчаты працуюць на будоўлі і гатуюць ежу на ўвесь атрад, яны яшчэ робяць непрыкметную для сябе і для іншых, але надзвычай важную справу: яны, так сказаць, «змякчаюць норавы». Ва ўсякім разе, іх заслугай я лічу тое, што за час свайго знаходжання ў атрадзе ніводнага разу не пачуў папроку на іх.

А тым часам перакур у «кают-кампаніі» працягваецца. Цяпер ужо камандзір, паказваючы на звышгіганцкі камень, гаворыць:

— І як мы яго на машыну ўзвалілі — розуму не дабяру.

Усе на хвіліну задумваюцца. Чуюцца ўжо словы, што, маўляў, нам усё пад сілу, як раптам хтосьці схамянуўся:

— Браточкі, дык ён жа тут і ляжаў!

Рогат. Гэта сапраўды смешна, і я смяюся разам з усімі. Але пра сябе думаю, што гэтыя хлопцы сапраўды ўсё могуць, ім сапраўды ўсё пад сілу,

КАНЕЦ рабочага дня. Хлопцы складаюць інструмент і стомленыя, але задаволеныя накіроўваюцца па дамах. Я прашу чытача прабачэння за гэты банальны выраз, але тут нічога не зробіш: рабяты разыходзяцца менавіта стомленыя і менавіта задаволеныя. І ў «кают-кампаніі» застаюцца толькі камандзір, камісар і брыгадзіры. Маленькая планёрка.

— Значыцца так, хлопцы,—пачынае камандзір, — Чатыры чалавекі на ямы, астатнія — сюды і сюды, — паказвае ён на плане.

— Башмакі нядрэнна б зрабіць, — гледзячы на стол, гаворыць адзін з брыгадзіраў — Саша Лазавенка.

— Узроўні хутка будуць? — цікавіцца Валодзя Нічыпар.

— Узроўню няма. Пакуль што не патрэбны, майстар сказаў.

Майстар — гэта Юрый Іосіфавіч Жыгал. Ён працуе ў «Міжкалгасбудзе», у яго некалькі аб'ектаў, але ў студэнтаў ён бывае амаль кожны дзень. І свае абяцанні наконт інструмента і будматэрыялаў заўсёды выконвае.

— Добра! — адгукваецца Валера Раманоўскі.

Планёрка працягваецца якіх некалькі мінут. Ды аб чым тут доўга гаварыць, калі і без таго кожны ведае сваё месца і кожны будзе працаваць, колькі трэба будзе. У атрадзе не прызнаюць слова «не магу». Кожны робіць любую работу. І ўсё ж брыгадзіры стараюцца паставіць чалавека туды, дзе яму больш падабаецца. І стараюцца, каб ніхто не займаўся доўга занадта цяжкай работай, лепш няхай працуюць пазменна. Затое ўжо канчатковае рашэнне камандзіра і брыгадзіраў — закон.

Але на планёрцы вырашаюцца не толькі вытворчыя пытанні. Камісар раптам схамянуўся: сёння ў адной з дзяўчат—Валі Крамер, дзень нараджэння. Трэба павіншаваць. І вось за вячэрай Валі ўручаюць вялізны букет.

ПАСЛЯ вячэры звычайна распальваюць касцёр, хлопцы і дзяўчаты рассаджваюцца хто дзе, і пачынаецца імправізаваны канцэрт —турысцкія і студэнцкія песні. Сола на гітары — Навум Гарэлік. Такі канцэрт працягваецца звычайна да поўначы. Пасля дванаццаці камандзір устае, і гэта сігнал да адбою. Праўда, некаторыя умудраюцца прасядзець на беразе возера да раніцы. Але ўдваіх, так што іх можна зразумець.

Я пытаюся ў камандзіра, ці не збіраюцца студэнты даць такі ж канцэрт у сельскім клубе. Ён адказвае, што так, яны хацелі выступіць з канцэртам, але старшыня папрасіў адкласці гэта — усе людзі заняты на пакосе, работы па горла. З той жа прычыны адкладзен футбольны матч са зборнай калгаса

ГАСНЕ касцёр, мы ідзём дадому. Таварышы мае хутка засынаюць, а я доўга не магу заснуць, ляжу і думаю.

Мне падабаюцца гэтыя хлопцы. Мне падабаецца іх энтузіязм, іх работа, іх дружба. Падабаюцца словы Валодзі Нічыпара: «Сапраўдны адпачынак — тут. А што дома ці на курорце — толькі стомішся ад суму». І яшчэ падабаецца тым, што гэтыя хлопцы і дзяўчаты, на мой погляд , уяўляюць сабой тып інтэлігента, які любіць папрацаваць фізічна, калі гэта трэба. І ён ставіцца да фізічнай працы гэтак жа добрасумленна, як і да разумовай, ды яшчэ з выдумкай, з энтузіязмам, з сапраўдным творчым запалам. Гэта і падабаецца мне больш за ўсё.

І зусім не абавязкова брату — студэнту ехаць кудысьці за тысячы кіламетраў у пошуках рамантыкі і працоўных мазалёў. Тут, зусім недалёка ад дома, ёсць вельмі многа і працы, і рамантыкі, якая чакае такіх вось, як гэтыя вясёлыя і няўрымлівыя фізікі, лірыкі.

Р. НІКІФАРОВІЧ.

> **«У кожным чалавеку стоена мудрая сіла будаўніка... Трэба даць ёй развівацца і расквітнець, каб яна ўзбагаціла зямлю яшчэ большымі цудамі».**
>
> Максім ГОРКІ

СЦЯГ РАЗВІНАЮЦЬ НА СВІТАННІ



Я памятаю гэтых хлопцаў. Ехаў з імі ў адным эшалоне: яны — будаваць у стэпе цагельны завод, я — у абласную газету. І хоць па дарозе мне даводзілася бываць у кожным вагоне, больш за ўсё я затрымліваўся іменна ў першым. Там, дзе ехалі яны. Затрымліваўся не таму, што на дзвярах вісела запрашэнне: «Сардэчна запрашаем», а таму, што тут было весела, цікава. Камандзір атрада Слава Кудзян гаварыў:

— Прыязджайце, не пашкадуеце!

І вось я ў студэнцкім будаўнічым атрадзе. Сплю непрабудным сном. Закачала ў дарозе. Нарэшце, з цяжкасцю праціраю вочы, гляджу на гадзіннік — 6.00. Праз трыццаць мінут — пад'ём.

Рэзкі гук горна будзіць раніцу. Яго падмяняе вясёлы баян. Не ведаю, куды падзеўся сон. Ускокваю. Разам з хлопцамі бяжым на возера. Адзін за адным з трампліна кідаемся ў ваду. Халадок скоўвае мускулы, праз якія-небудзь пяць хвілін мы на беразе. Спарторг атрада Слава Стрыбук праводзіць фіззарадку. Зноў кідаемся ў ваду, і роўна ў сем гадзін мы — у сталоўцы.

На лінейку становяцца ўсе. У дзве шарэнгі. Дзяжурны атрада Валодзя Сачэнка падае каманду:

— Раўненне на сярэдзіну!

Ён дакладвае камандзіру аб гатоўнасці «байцоў» (так называюць сябе студэнты) пачынаць работу. Лінейку праводзіць камандзір. Учора вечарам была планёрка, падводзілі вынікі работы. Лепш за ўсіх папрацавала комплексная брыгада «Нарач» Валодзі Паўлава. І лепшаму байцу гэтай брыгады цесляру Лёню Змушко прадстаўлена права падняць сцяг. Усе заміраюць на «Смірна!».

Некалькі мінут—на заданні брыгадзірам. Пытанні, адказы—і лінейка закончана. Хлопцы чакаюць машыны, бо да аб'ектаў далёка.

Яны будуюць у саўгасе цагельны завод. Яго магутнасць — дзесяць тысяч штук цаглін у дзень. Кіруе брыгадай Адам Неўмяржыцкі. Працоўная біяграфія гэтага хлопца пачалася на цаліне, яшчэ ў 1958 годзе, пасля школы. Потым марфлот, быў падводнікам, а затым ужо інстытут і — зноў цаліна.

Пачаўся перакур. Не анекдоты пачалі «травіць» студэнты. Не казкі расказваць. Хлопцы спрачаюцца аб літаратуры. Але ў камандзіраў аб'ектаў многа. Яны спяшаюцца. І мы ад'язджаем.

Спідометр адлічвае кіламетры — пяць, восем, дзесяць... За дваццаць два кіламетры ад цэнтральнай сядзібы працуе брыгада Івана Стрыбука — робіць дом для чабана.

Валодзя Сачэнка і Коля Пырко замешваюць гліну. Толя Сініцын і Слава Стрыбук выкладваюць «вугалок». На сцяне сядзяць Валодзя Сыч і Толя Аштапенка.

Успамінаючы, Слава Стрыбук расказвае:

— Тут вось, кіламетраў за пяць ад нас, працавалі на плантацыях дзяўчаты — студэнткі Уральскага педагагічнага інстытута. Мы з імі наладзілі шэфскую дзелавую сувязь. Разам рэпетыравалі канцэрты. А калі ў іх работы закончыліся; яны, ад'язджаючы, падарылі нам на памяць гэтыя касынкі.

Гісторыя простая і звычайная. Але калі б вы ведалі, з якой павагай успамінаюць хлопцы сваіх «падшэфных», з якой гордасцю носяць гэтыя касынкі дзяўчат. А як працуюць! Нездарма брыгада Стрыбука заваявала ганаровае месца стаяць на лінейцы на правым фланзе.

Пакуль мы абедалі, Слава расказаў пра Кацю Прыдыбаеву. Не хацелі хлопцы браць яе ў атрад. Хіба толькі на кухню, у падсобнікі...

І яшчэ пра аднаго чалавека расказаў камандзір, пра Лёню Змушко.

— Я думаў, што ён будзе лішнім у атрадзе. Не ведаў, што з ім рабіць. У інстытуце заўсёды такі ціхі, сарамлівы, — прыпамінае Слава, — а тут...

Тут Лёня Змушко, як кажуць, праявіў сябе. Нездарма ў атрадзе яго называюць рэкардсменам па падняццю сцяга на ранішняй лінейцы.

Хлопцы адпачнулі. Пайшлі на аб'екты. А Вера Глушкевіч і Оля Талкач не ідуць. Яны — кухары. Ім работы хапае. З чатырох раніцы і да дзесяці вечара.

Камандзір атрада Слава Кудзін і майстар Барыс Высоцкі сядзяць у пакоі з надпісам «Штаб». Ім ніхто не перашкаджае. Яны думаюць, вырашаюць, спрачаюцца аб рабоце, аб заўтрашнім дні, каго куды накіраваць. Гэта вельмі важна. І як быць з машынамі? Сёння зноў саўгас «не даў» самазвал. Вядома, камандзір знайшоў выхад: максімальная загрузка і ні хвіліны прастою. Сам кантраляваў. На васьміквартэрны дом заўтра патрэбен адзін падсобнік. Дзе яго ўзяць? Адкуль высвабадзіць? Заканчваецца таксама гравій. Падумай і аб гэтым. Думае камандзір. Думае майстар...

У 23.00 у інтэрнаце гасне святло. Але не адразу засынаюць будаўнікі, хоць і стаміліся за дзень. Думаюць: заўтра яны пачынаюць новыя аб'екты, аб'екты звыш плана. І вельмі хочацца закончыць іх да ад'езду. Тут і спаборніцтва, і эканомія, і творчая думка... А яна ў студэнтаў ніколі не гасце...

А. ГРАДЗЮШКА,
студэнт аддзялення журналістыкі.

СПОРТ

ГАВОРЫЦЬ ШАШАЧНЫ КЛУБ БДУ

☆ ☆ ☆ ☆ ☆

ДУЭЛЬ ЧЭМПІЁНАЎ

ДАЛЁКА ЗА МЕЖАМІ НАШАЙ РЭСПУБЛІКІ ЗАВАЯВАЎ САБЕ СЛАВУ ШАШАЧНЫ КЛУБ УНІВЕРСІТЭТА. ДАРЭЧЫ, ЁН АДЗІНЫ. ІНШЫЯ ВНУ КРАІНЫ НЕ МАЮЦЬ ТАКІХ КЛУБАЎ. КАЛЕКТЫЎ НАЛІЧВАЕ 5 МАЙСТРОЎ СПОРТУ, 20 КАНДЫДАТАЎ У МАЙСТРЫ І ЗВЫШ 200 РАЗРАДНІКАЎ. ЗБОРНАЯ БДУ — БРОНЗАВЫ ПРЫЗЁР УСЕСАЮЗНАГА ЧЭМПІЯНАТУ МІНУЛАГА ГОДА. ЯЕ ПРАДСТАЎНІКІ ЛЕНА СОРКІНА І ГЕНАДЗЬ ХАЦКЕВІЧ СТАЛІ Ў ГЭТЫМ ГОДЗЕ ЧЭМПІЁНАМІ РЭСПУБЛІКІ І МАЙСТРАМІ СПОРТУ ПРА ІХ І ПОЙДЗЕ СЁННЯ НАША РАЗМОВА.

МАТЧ ВЯДЗЕ ЧЭМПІЁН РЭСПУБЛІКІ

Вельмі кароткі, усяго трохгадовы шлях ад навічка да майстра спорту ў Генадзя Хацкевіча. Сёння мы знаёмім вас з яго творчасцю:

В. Ганчароў — Г. Хацкевіч

Ход чорных.

Сілы чорных перагружаны ў цэнтры.

Пры правільных адказах чорныя хутка губляюць хады. Але чорныя, глыбока ўнікнуўшы ў суць пазіцыі, арыгінальным, да гэтуль не вядомым спосабам дасягаюць нічыёй.

1... ef6 2. ed2 fg5! 3. de3 fe7. 4. hg7. Белыя ўжо амаль у дамках. Але 4... cb4!! 5. ae5 f(калі 5. fh6 bc3! ec5 ca1 hf8 db4 fa3). (На fb8 ac3! Гэты ход ліквідуе перашкоды на шляху простай b4 у дамкі, так як на bf4 мажліва ca1 ac3 ag1 і шашка g3 прайграна. Пры іншых прапановах, напрыклад, 9. ab6 або 9. ba7 чорныя ходзяць шашкай b4 на a1 і нічыя непазбежна) ad4 gf4 dg1. Калі цяпер 10. hg7 то 10... cb6! ac7 gh2. А пасля 10. ab2 gh2 11. be5 hg3 з нічыёй] 5... ef6 fh6 dh2 7. ge5 hg1 і ўжо белым прыйшлося тэрмінова дабіваца нічыёй шляхам 8. ed4 і 9. hg7.

Г. Хацкевіч—М. Капусцінскі.

1. hg3! Моцны ў пазіцыйных адносінах ход з лавушкай.

1... dc7? Чорныя цяпер разлічваюць пасля размену ed6 утрымаць звязку правага флангу белых. Але белыя на гэта і разлічвалі. Далей 2. cd6!! ec5 3. fe5 gd4 4. eg4 ge3 5. bc3 db2 6. fd8 hf2 7. ac1 і чорныя здаліся.



В. Федасенка—Г. Хацкевіч.

Пераацаніўшы свае магчымасці белыя памылкова сыгралі на выйгрыш 1. ge3? Праігрывае, трэба было 1. bc3! з пазіцыйнай перавагай белых. Цяпер жа чорныя правялі ў адказ на памылковае нападзенне белых разгромную камбінацыю:

1... fg5!! 2. hd4 gh6! 3. eg 5. hf4 4. ge5 df4 5. bd6 ce1 і чорныя здаліся.

Л. Соркіна—Г. Хацкевіч.

(ход белых)

Пазіцыі белых на першы погляд лепшая, так як яны валодаюць цэнтрам. Аднак глыбокі разлік паказвае, што нават дасягненне белымі нічыёй у гэтай пазіцыі — нялёгкая праблема. Справа ў тым, што белыя маюць слабы левы фланг, а правы фланг — няразвіты, з адстаючай шашкай. 2. Імкнучыся да актывізацыі гульні белыя сыгралі 1. dc5? db4 2. ba3. На гэта нечакана паследавала — 2... fe5!! 3. ac5 cb6! 4. ca7 hg4 5. eg5 hf4 6. ed2 ab4. І з лішняй шашкай белыя павінны былі здацца.



Г. Хацкевіч—А. Карпаў.

(ход белых)

Пазіцыя вельмі вострая. З двух бакоў шансы як бы роўныя. Але ход у белых, і яны цікава дасягаюць перамогы...

1. de5! fd4 2. ee7 fd6 3. hg!! У гэтым уся справа. 3... cb6 4. ba3 hg7 5. gh2 de5. Апошняя надзея чорных. Але і яна не дапамагае. 6... fd6 gf6 7. hf4! fe5 8. hg3! ec7 9. cb4 ae5 10. fb8 і чорныя здаліся.

Г. Хацкевіч—М. Рафальскі.

(ход белых).

1. ab4!! Як гаворыцца на роўным месцы, белыя аддаюць шашку 1... bc5, чорныя не супраць выйграць. 2. cd4! ca3 3. fg3! ba7 белыя спакойна гуляюць без шашкі (высвятлілася, што нельга было 3... de5 ад таго што 4. ed2!! ee1 5. ge5 fd4 6. cb2! ac1. 7. gf2 eg3 8. hf4 cg5 9. hg1 з разгромам чорных) 4. ge5 df4 5. gf2! Чорныя думалі, што белыя празяваюць і вырашылі прыгарнуць да рук другую белую шашку 5... fe3? Але тут чорных чакала разгромная камбінацыя 6. de5! eg1 7. hg3 fd4 8. ef2 ge3 9. gf4 eg5 9. hg1 і белыя выйгралі.

Хацкевіч—Кісялёў.

(ход белых).

Белыя арыгінальным, каштоўным для практыкі спосабам перамагаюць.

1. cd6!! ce5. Прыходзіцца 2. de3 fd2 3. hd6 ec5 4. ec3 de7 5. bd6 ec5 6. cd4 ce3 7. fd4 і суадносіны дзве на дзве ў карысць белых.

№ 8. Г. Хацкевіч—В. Вайцашчук.

Прыклад двух розных стратэгічных планаў. У той час, як белыя імкнуліся да захопу цэнтра, чорныя праводзілі яго абхват з флангаў. Здаецца, што стратэгія чорных бярэ верх, так як пасля 1. gh4? fg5! 2. hf6. cd6 3. ec7 bd8! 4. db6 ge1 5. ba7 eh4 белым трэба здавацца. Аднак сіла цэнтральных шашак белых настолькі вялікая, што нават аддаючы шашку, яны атрымліваюць перавагу. Белыя іграюць 1. ed6! ce7? Чорныя пажаднічалі. Пасля правільнага 1... ce5! 2. fb4 ac5 3. gf4! fg5 4. fe5! Чорныя точнай абаронай маглі б дабіцца нічыёй. Цяпер жа яны праігрываюць. 2. dh4 cd6. Камбінацыя 2... bc5 3. dd8 fg5 4. hf6 de1 5. dh4 прыводзіць да пройгрышнага эндшпілю чорных. 3. cb2!! ac1 4. de5 fb2 5. dc3 bd4 6. ea7 cg5 7. hd8 ab4 8. ab8 dc5 9. ba7 gf6 10. dh4 і чорныя здаліся.



В І Н Ш У Е М !

Два тыдні ў сталіцы Кабардзіна-Балкарскай АССР у горадзе Нальчыку ішлі ўпорныя паядынкі мацнейшых шашыстак краіны. Права на ўдзел у фінале X юбілейнага першынства СССР заваявалі студэнты нашага універсітэта Аня Хапалюк і Лена Сарокіна.

Незвычайна кароткім быў шлях Ані ад пачынаючай да вядомай шашысткі краіны. За гэты кароткі адрэзак часу яна двойчы пабывала чэмпіёнкай Савецкага Саюза сярод студэнтак. На жаль, у сувязі з абаронай дыпломнай, яна не змагла прыняць удзел у спаборніцтве ў Нальчыку.

І Лене прыйшлося выступаць адной. Калі Аня рабіла свае першыя крокі да майстэрства, Лена ўжо была чэмпіёнкай СССР сярод дзяўчат. Пасля яна паспяхова выступала ў чэмпіянатах рэспублікі, двойчы заваёўвала залатыя медалі і тройчы сярэбраныя. Апошнія тры гады яна ўваходзіць у дзесятак мацнейшых шашыстак краіны. Асабліва багаты ў Лены гэты год. На першынстве ВЦСПС у маі яна дзеліць другое—трэцяе месца з чэмпіёнкай краіны І. Спаскай, прапусціўшы наперад двухразовую чэмпіёнку Савецкага Саюза С. Агароднікаву.

Майстарскі рубеж пераадолены. І вось юбілейны чэмпіянат. Выдатны старт: нічыя з С. Агароднікавай і перамога над чэмпіёнкай Літвы Аўгусцінайтэ далі мажлівасць Лене ўвайсці ў лік лідараў. І толькі новай чэмпіёнцы І. Спаскай удалося далёка выйсці наперад. Перамога над Эстэркінай і Ціхеевай яшчэ больш замацавалі яе турнірнае становішча. Але нечаканы пройгрыш Станге не далі ёй увайсці ў лік прызёраў—усяго толькі паўачка аддзялілі яе ад бронзавага прызёра масквічкі Р. Гагарынай.

Упершыню шашыстка з Беларусі паднялася так высока ў турнірнай табліцы першынстваў краіны. Яна стала адзіным майстрам спорту СССР па шашках сярод жанчын, заваяваўшы гэтае званне ў гэтым годзе. Дый да таго ж Лена самая юная сярод іх.

А цяпер мы пазнаёмім вас з творчасцю Лены.

Л. СОРКІНА—Р. ЭСТЭРКІНА

1. cd4 de5 2. bc3 ed6 3. ef4 fe7. Сістэму з ходам 3.. fe7 тэорыя лічыць некалькі слабай для чорных. Але складанасць пазіцый дае практычную мажлівасць для поспеху абоіх ігракоў.

4. ab2! Выдатнейшы ход! Пасля якога некаторая пазіцыйная перавага белых. 4... bc5 5. db6 ca5.

Дрэнна было б 5... ac5 6. cb4 fg5 7. bc3 de3 8. fb6 ca3 9. df4! ed3 10. hf4 і пасля 11. bc5 з перавагай у цэнтры.

6. fe3 fg5 6. gh4 eg3 8. hf2 de5. Лепшы план ураўнення пазіцыі прапанованы выдатным савецкім шашыстам, чэмпіёнам СССР 1936-41 гадоў В. А. Сокавым. Нельга дазваляць хода cd4 пасля чаго ў белых моцная пазіцыя. 9. ef4 eg3 10. hf4 ge3 11. df4 ed6 12. cd4 ab6 13. bc3 (Прайграе 13. cd2 dc5! і hg5 gf6) 14. cd2 hg1 15. fg3! bc5 (На fg5 следуе de3 gh4 ed2 hf2 fe5 з перавагай белых) 16. db6 ac7 17. gh4! dc5? прайграюць. (Горшую, але абараняемую пазіцыю, атрымоўвалі чорныя пасля fe5) 18. de3 cd6 19. ed2! de7 20. gh2 ba7 (На 20. fe5 раshae ed4 21. eg3 hf4 22. cc1 cd4 23. cg5. 24. hd8 bc7 25. da5 dc5 26. db6×. (На 20. bc7 hg3 21. cb6 cd4 22. ba3×) 21. cb4 ge5. (На 21. ab6 ba5 22. ge5 ac7 23. eg3 ce5 24. ef6 hf2) 22. d3 eg3 23. hf4 ef6 24. cd4 de5 25. fd6 ce7 26. ef4 і чорныя здаліся.

КЛУБАМ КІРУЕ ГЕНАДЗЬ ДРАБУШЭВІЧ

На сходзе шашыстаў універсітэта, які адбыўся другога верасня, былі выбраны кіруючыя органы універсітэцкай шашачнай федэрацыі. Старшынёй яе зноў абраны асістэнты кафедры электронных вылічальных машын Генадзь Драбушэвіч. Намеснікамі абраны Аляксандр Чахаўскі і Лена Соркіна. Членамі праўлення абраны Ч. Роліч, А. Гантвараг, Г. Пятровіч, А. Стуканаў, М. Рафальскі, У. Беляеўскі, Б. Агашын. Рэдактарам газеты шашачнай федэрацыі абраны аспірант Чэслаў Роліч, яго намеснікам Уладзімір Беляеўскі. Зацверджаны склад зборнай БДУ на матч са зборнай Беларусі і Літвы на 25 дошках.

Зборная БДУ: Мужчыны, майстры спорту Г. Хацкевіч, М. Кац, А. Гатварг, Я. Кухарчук (усе матфак).

Кандыдаты ў майстры:

Б. Бліндэр (матфак), Г. Драбушэвіч (фізфак), Ю. Струк, У. Беляеўскі, П. Несцяровіч, Б. Агашын, У. Лахаданаў (усе матфак), Г. Пятровіч, А. Чахаўскі (фізфак), І. Марголін, В. Федасенка, А. Абрамовіч (матфак), М. Рафальскі (хімфак), Д. Сухарукаў (фізфак). Г. Пеўзнер (матфак), Е. Самойлавіч (геафак).

Жанчыны.

Л. Сорміна (матфак), А. Хапалюк, Л. Ільіна, Л. Лаўрыновіч, Г. Фрыд (фізфак).

Рэдактар А. ЛОЙКА.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 112, тэл. 2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. 1199. АТ 01081.